■ Нотны радок

# Светлыя згадкі

Зоркі і васількі сплятаюцца ў «Вянок» у Белдзяржфілармоніі

Падарунак на дзень нараджэння Максіма Багдановіча сёлета падрыхтаваны Нацыянальным акадэмічным народным аркестрам імя Іосіфа Жыновіча: аднаўлена праграма «Вянок», створаная калісьці Уладзімірам Мулявіным і «Песнярамі».

У 1991-м гэта быў не проста ўспамін пра беларускага лірыка Максіма Багдановіча. Гэта быў цыкл песень, які даваў магчымасць адчуць смак мовы — важная тэма, асабліва актуальная на той час. А 100-годдзе Багдановіча было яшчэ адной нагодай прыслухацца, услухацца. Пачуць. І засведчыць — ва ўвесь голас, — што ёсць нацыя, якая натхняла паэта Багдановіча. Нездарма праграма «Вянок», створаная паводле яго вершаў "Песнярамі», прагучала ўпершыню ў Бібліятэцы Аб'яднаных нацый у Нью-Ёрку. Нібыта маніфест — для іншых. Аднак патрэбна гэта было найперш на радзіме, якая тады ўсведамляла сябе.

Але праграма цалкам на радзіме была выканана «Песнярамі» толькі адзін раз: 9 снежня 1991 года ў Белдзяржфілармоніі. Вельмі прадуманая як па драматургіі, так і па музыцы, яна выводзіла вобраз паэта, прапаноўвала паразважаць пра яго лёс. Разважлівы тон задае песня «Ой, чаму я стаў паэтам», і далей мы разам з ім (героем) думаем пра жыццё на радзіме і на чужыне, шукаем шчасця і марым пра каханне пад светлымі зоркамі. Ідзём за зоркай і імкнёмся наперад — не спыніць.

Вянок — гэта кола з кветак. І ў музычным «Вянку» ўсё так. Некаторыя песні з гэтай праграмы мелі свой лёс і ўжо былі папулярныя: «Вераніка» (Ігара Лучанка) і «Зорка Венера» (з музыкай Сымона Рак-Міхайлоўскага). Але праграма нарадзіла яшчэ шэраг хітоў, напрыклад задорную песняроўскую «Лявоніху». А лірычныя «Слуцкія ткачыхі»? Таксама песня стала гучаць як самастойны твор. Яшчэ некалькі цудоўных лірычных песень гучалі потым у выкананні розных беларускіх артыстаў. Зварот да твораў з цыкла «Вянок» так ці інакш быў. Асабліва калі трэба было ўспомніць Паэта: гучалі пранікнёныя прыгожыя песні «Па-над белым пухам вішняў» ці «У Максіма на кашулі вышыты галубкі». На гэта папрацаваў кампазітар і аранжыроўшчык Ігар Палівода, стварыўшы рок-оперу «Максім», — гэта ўжо крыху іншая гісторыя, але таксама натхнёная Багдановічам.

Цяпер у нас ёсць магчымасць пачуць «Вянок» такім, як ён гучаў тады ў разуменні Уладзіміра Мулявіна. І ў гэтым ёсць самая вялікая інтрыга: бо музычны матэрыял цяпер аднаўляўся па захаваных рэпетыцыйных запісах. У «Песняроў» заўсёды быў моцны і адданы фан-клуб з вялікай колькасцю прыхільнікаў у розных гарадах былога Саюза. У прыватнай калекцыі Уладзіміра Пазняка з Масквы знайшоўся аўдыязапіс прагону праграмы «Вянок» у Белдзяржфілармоніі (1991 года). На падставе яго лічбавай копіі і па ініцыятыве яе ўладальніка «Вянок» аднаўляўся ў беларускім аркестры ў поўным аб'ёме: усе 15 песень.

Але 10 снежня прагучаць яны ў іншых аранжыроўках — Аляксандра Крамко, ён жа дырыжор канцэрта. У XXI стагоддзі музыка змянілася, і вядомыя творы могуць набываць новыя адценні. Тым больш, што гэтаму так ці інакш паспрыяюць і іншыя выканаўцы. Найперш аркестр імя Жыновіча, але гэта той калектыў, дзе вельмі паважліва і ашчадна ставяцца да літаратурнай спадчыны і яе музычнага ўвасаблення. Бярэ ўдзел у канцэрце рок-спявак Ян Жанчак (які асабліва адчуў песняроўскія традыцыі ў працы), Вячаслаў Ісачанка, Андрэй Шчыткавец і Сяргей Шкурдзэ (з гурта «Спадчына»), саліст аркестра імя І. Жыновіча Андрэй Коласаў, вакальны гурт «Дыямант».

Ларыса ЦІМОШЫК. tsimoshyk@zviazda.by

■ Кінакрокі

# НЕЗАЛЕЖНАЕ КІНО СУПРАЦЬ «ПРАФЕСІЙНАГА»

## То грошай няма, то драматургіі — беларускія кінематаграфісты разышліся па двух лагерах

**На шчасце альбо на жаль, не бывае так, каб наконт нейкай з'явы склалася агульнае меркаванне. Вось, напрыклад, у нас на фоне зацяжнога крызісу айчыннага кінематографа, бяссілля нацыянальнай кінастудыі і сцэнарнага голаду з'явіўся незалежны кінематограф, прынамсі, больш адчувальны незалежны кінематограф. Ён, у адрозненне ад «Беларусьфільма» з яго ідэалагічнымі і камерцыйнымі задачамі, уступае ў сувязь з рэальнасцю, выкарыстоўвае магчымасці мовы, знаходзіць цікавыя падыходы, часам дэманструе нешаблоннае мысленне, адгукаецца на актуальныя тэмы і ў цэлым абяцае беларускаму кіно светлую будучыню. Думаеце, незалежны кінематограф як з'ява выклікае толькі станоўчыя водгукі? Натуральна, не.**

Падкрэслю, што гаворка ідзе не пра асобныя фільмы, а пра феномен ці, скажам, тэндэнцыю ў цэлым. Так, часам тое, што мы бачым з незалежнага, і кіно назваць нельга, але менавіта ў гэтай сферы апошнія некалькі гадоў назіраецца ўрадлівая актыўнасць. І калі на адным баку фільмы «Сляды на вадзе», «З 8 Сакавіка, мужчыны!» і серыялы для ў першую чаргу расійскага тэлеэкрана, незалежныя карціны з больш цвярозым поглядам на навакольную рэчаіснасць я прымаю як манну нябесную. Нават з іх недасканаласцю здаецца, што якая-ніякая будучыня нашага кіно стаіць за неўладкаванай, але свабодай, а не за ржавай ледзь паваротлівай сістэмай дзяржаўнага фінансавання.

Праўда, мяркуючы па ўсім, такая расстаноўка сіл затрымаецца на нашай тэрыторыі яшчэ надоўга: распрацаваны Міністэрствам культуры рэзанансны праект указа Прэзідэнта «Аб мерах па стымуляванні развіцця кінематографа» аказаўся ўказам аб мерах па стымуляванні развіцця «Беларусьфільма», што пацвердзіла Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, да якога ад усёй кінасупольнасці звярнулася Майстэрня сацыяльнага кіно. Майстэрня, дарэчы, кінасупольнасць і аб'яднала, калі праект указа быў на кароткі тэрмін вынесены на грамадскае абмеркаванне, дамагласа адтэрміноўкі апошняй магчымасці ўнесці ў яго свае прапановы, арганізавала некалькі сустрэч прадстаўнікоў сферы кінематографа, сфарміравала папраўкі і адправіла іх на разгляд. Вынікі, якія хутка мусяць стаць вядомымі, пакажуць, у якой ступені голас непасрэдных дзеячаў кінаіндустрыі ўлічваецца пры лёсавызначальных рашэннях.



«З 8 Сакавіка, мужчыны!», «Беларусьфільм».



«Граф у апельсінах» Улады СЯНЬКОВАЙ.

А пакуль цікава назіраць, як у гэтай сістэме адны паблажліва адзываюцца пра «безнадзейны» «Беларусьфільм» (і гэта лагічная выснова), а іншыя кажуць, што ў фільмах, напрыклад, нацыянальнага конкурсу «Лістапад» (а ён збірае ў сабе найлепшае беларускае кіно, і абсалютную большасць яго праграмы складаюць незалежныя карціны) «няма прафесіі». А самае любімае, калі нехта, хто мае дачыненне да «афіцыйнага лагера», трыумфуе пасля адмоўных рэцэнзій на незалежныя работы.

Але, калі зірнуць праўдзе ў вочы, самыя цікавыя фільмы, нягледзячы на тое, што дзяржаўныя грошы ў асноўным застаюцца на «Беларусьфільме», сапраўды ствараюцца незалежнымі маладымі аўтарамі. Я не ведаю, ці трэба тлумачыць, што карціна «Заўтра» Юліі Шатун, якая сёлета стала найлепшым ігравым фільмам нацыянальнага конкурсу «Лістапад», з любога пункту гледжання цікавейшая за баявік нацыянальнай кінастудыі. Што на найпрэстыжнейшым фестывалі дакументальнага кіно IDFA ў Амстэрдаме беларускае кіно прадстаўляе Настасся Мірашнічэнка з карцінай «Дэбют», створанай аўтаномна ад фінансавай падтрымкі дзяржавай. Што ў простым фільме Вольгі Дашук «Партрэт» для Белсата больш ідэі, чым у знятым на кінастудыі яе ж фільме «Сяргей Плыткевіч. Чалавек з фотаапаратам».

Здаецца, можна было б кансалідавацца: маладыя і перспектыўныя аўтары рабілі б свае праекты на Нацыянальнай кінастудыі. Трэба сказаць, нешта на гэтай ніве «Беларусьфільм» сапраўды імкнецца рабіць, але дазвольце не паверыць у паспяховасць гэтай ідэі: тыя, хто меў стасункі з кінастудыяй, вяртацца туды звычайна не хочуць; тыя, хто не меў гэтых стасункаў, таксама аддалі б перавагу іншым магчымасцям, а новы альманах дэбютаў «Мы», не так даўно прадстаўлены «Беларусьфільмам», пацвердзіў, што нават работа на кінастудыі маладых і перспектыўных не заўсёды дае належны вынік.



«Падарунак Санта-Клауса» з альманаха «Мы» «Беларусьфільма».



«Душы мёртвыя» Віктара КРАСОЎСКАГА.

Справа ў тым, што архаічная сістэма, якой, нягледзячы на расхваленую рэканструкцыю, з'яўляецца нацыянальная кінастудыя, ужо даўно не ўпісваецца ў сучасны свет. Пакуль уся Еўропа



«Сляды на вадзе», «Беларусьфільм».



«Заўтра» Юліі ШАТУН.

жыве з пітчынгамі, фондамі і кінацэнтрамі, а некаторыя ўвогуле заглядваюць у далёкую будучыню і прадракаюць знікненне аўтарскага мастацтва і перамяшчэнне ўсяго кіно ў інтэрнэт, гэта значыць разважаюць нават пра несучасныя, а наватарскія канцэпцыі, мы ж маем «Беларусьфільм». І праект указа па кінематаграфіі мысліць усё тым жа ўчарашнім днём — не развіццём кіно, а кароткай падтрымкай дзяржаўнай кінафабрыкі.

Здавалася б, відавочна, што «Беларусьфільм» — гэта нязграбная сістэма мінулага, што трэба даваць грошы маладым кінематаграфістам, што хоць нейкая свядомасць перамясцілася ў пакулі нетрывалае, але незалежнае кіно. А потым абсурд, што мы назіраем у стаўленні дзяржінстытуцый да айчыннага кіно, становіцца зразумелым, калі разглядаць яго ў простай логіцы — нежаданні ўкладвацца ў доўгайграючыя арыентыры, а імкненні да большай імавернасці, што беларускае кіно зможа зарабіць грошай. Серыяламі яно і заробіць, але беларускі кінематограф так і застанецца бясслаўнай чорнай безданню.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

# Опера ў імёнах:

## Мінскі міжнародны Калядны оперны форум восьмы раз запрашае гасцей

VIII Мінскі міжнародны Калядны оперны форум, які традыцыйна ладзіцца ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі ў снежні, штогод збірае вядомых оперных спевакоў з усяго свету. Генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Уладзімір Грыдзюшка падчас прэс-канферэнцыі расказаў, што ўвесь час свайго існавання калядны форум прытрымліваецца адзінага фармату: на сцэне ідуць прэм'ерныя спектаклі. За адным выключэннем: штогод у праграму традыцыйна ставяць оперу Жоржа Бізэ «Кармэн», з якой пачалася гісторыя тэатра. Падчас восьмага форуму Вялікі тэатр Беларусі прадэманструе тры прэм'еры бягучага года і адну пастаноўку ад артыстаў Падляскай оперы і філармоніі (Еўрапейскі цэнтр мастацтваў у Беластоку).

Распачне Оперны форум — 2017 «Чароўная флейта» В. А. Моцарта. Прэм'еру рыхтавала міжнародная каманда, якую ўзначальваў рэжысёр-пастаноўшчык Ханс Ёахім Фрай (знаёмы беларускаму гледачу па «Лятучым галандцу» Р. Вагнера). Партыі Царыцы ночы праспявае ўладальніца гана-



ровага тытула «Спявак свету» (перамога на міжнародным конкурсе оперных спевакоў Бі-Бі-Сі ў Кардыфе), двойчы лаўрэат Расійскай нацыянальнай тэатральнай прэміі «Залатая маска» Надзея Кучар: артыстка прызналася, што з нецярпеннем чакае свой выступ у «Чароўнай флейце», бо заўсёды марыла ўвасобіць Царыцу ночы ў спектаклі. Убачаць гледачы і прэм'еру ад галоўнага рэжысёра Вялікага тэатра Беларусі Міхаіла Панджавідзэ «Сельскі гонар» (у ролі Турыдца выступіць заслужаны артыст Расіі Ахмед Агадзі, Марыінскі тэатр).

«Кармэн» гэтым разам будзе паказана ў «польскай версіі»: беларусы сустрэнуцца з інтэрпрэтацыяй вядомай оперы ад рэжысёра Беаты Рэда-Добер ды артыстаў Падляскай оперы і філармоніі. Галоўную партыю выканае заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Аксана Волкава (дарэчы, за сваю Кармэн спявачка атрымала ўзнагароду IV Нацыянальнай тэатральнай прэміі ў намінацыі «Найлепшая жаночая роля ў спектаклі оперы»). Нягледзячы на тое, што Аксана Волкава прымерыла ролю іспанскай спакусніцы ўжо 16-ы раз, можна чакаць сюрпрызаў: запрошаны тэатр моцна асучасніў «Кармэн».

— Наш міжнародны оперны форум становіцца знакавай падзеяй для вакалістаў усяго свету, — адзначыла Аксана Волкава. — Вядатна, што ў Вялікім тэатры Беларусі ладзіцца і Мінскі міжнародны Калядны конкурс вакалістаў — оперны конкурс найвышэйшага ўзроўню, на які прыязджаюць таленавітыя маладыя спевакі, што займаюць прыкметныя месцы на сцэнах вядомых еўрапейскіх і амерыканскіх тэатраў. Выканаўцы, якія прайшлі гэтую школу, застаюцца нашымі сябрамі і часта вяртаюцца ў Вялікі тэатр Беларусі.

За асучасненай «Кармэн» гледачам прапануюць пагалядзець асучасненую «Травіяту» ў пастаноўцы латвійскага рэжысёра Андрэйса Жагарса. Новы беларускі варыянт шэдэўра італьянскай оперы пакажуць шосты раз. Партыі Альфрэда і Жэрмона выканаюць Юрый Гарадзецкі ды Уладзімір Пятроў, Віялету Валеры ўвасобіць Надзея Паўлава, уладальніца Гран-Пры Мінскага конкурсу вакалістаў — 2015. Заключным акордам форуму стане гала-канцэрт зорак сусветнай оперы, дзе беларускі глядач сустрэнецца з вядомымі выканаўцамі і пераможцамі IV Мінскага міжнароднага Каляднага конкурсу вакалістаў. На сцэну выйдуць 22 салісты з 15 краін свету, сярод якіх выступяць і трыумфатары калядняга конкурсу вакалістаў мінулага года Тыгран Аганян (Арменія) і Андрэй Немзер (Расія): Вялікі тэатр Беларусі, як і яго глядач, заўсёды памятае сваіх герояў.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.